была забяспечана прадметамі першай неабходнасці, а таксама махоркай.

Такім чынам, у першыя гады Савецкай улады была праведзена значная работа ў галіне матэрыяльнага забеспячэння рабочых. Для ўпарадкавання заработнай платы была ўведзена тарыфная аплата працы, аднак у сувязі з ростам цэн на прадукты харчавання яна была заменена натуральным забеспячэннем.

У гады грамадзянскай вайны і замежнай ваеннай інтэрвенцыі Савецкая ўлада вымушана была праводзіць палітыку «ваеннага камунізма». У гэты перыяд заработная плата не адыгрывала рашаючай ролі. Яна была абясцэнена ў рэальным выражэнні, таму галоўная ўвага надавалася харчоваму пытанню, ад вырашэння якога залежала захаванне чалавечага жыцця.

Неабходна адзначыць, што харчовая палітыка была адзіна правільнай у той цяжкі перыяд. У краіне былі ўведзены трывалыя дзяржаўныя цэны на хлеб, вялася барацьба з махлярствам і спекуляцыяй хлебам і іншымі прадуктамі. Прынятыя меры ў значнай ступені паляпшалі матэрыяльнае становішча рабочых, садзейнічалі іх захаванню як асноўнай прадукцыйнай сілы.

Мерапрыемствы Камуністычнай партыі і Савецкай улады, арганізацыйная работа мясцовых партыйных і савецкіх органаў адыгралі важную ролю ў справе паляпшэння матэрыяльнага забеспячэння рабочага класа.

*Гомельскі дзяржаўны універсітэт*

**Резюме**

На конкретно-историческом материале раскрывается деятельность Коммунистической партии и Советского государства по материальному обеспечению рабочих Белоруссии в годы гражданской войны и иностранной интервенции. Показывается помощь братских народов молодой республики в этом жизненно важном деле.

**Summary**

With reference to particular historical material the author reveals the CPSU and Soviet state activities concerned with material security of the Byelorussian workers in the period of the Civil War and Foreign Intervention. Fraternal assistance of the young Soviet Republic's nations is shown.

*М. М. ЗАБАЎСКІ*

## ПАЛІТЫЧНАЯ БАРАЦЬБА Ў БЕЛАРУСІ Ў ПЕРЫЯД ВЫБАРАЎ У III ДЗЯРЖАЎНУЮ ДУМУ

Адным з важнейшых момантаў у грамадска-палітычным жыцці Беларусі пасля паражэння рэвалюцыі 1905—1907 гг. былі выбары ў III Дзяржаўную думу. Даследаванне гэтага пытання дазваляе раскрыць спецыфічныя рысы палітыкі царызму ў перыяд сталыпінскай рэакцыі ў заходніх губернях, дзейнасць асноўных палітычных партый, іх тактыку ў новых гістарычных умовах, у якіх развіваліся ў гэты час грамадскае жыццё і культура ў Беларусі, рабочы і сялянскі рух. У беларускай гістарыяграфіі гэта пытанне асвятлялася толькі ў самай агульнай форме.

3 чэрвеня 1907 г. урадам быў апублікаваны маніфест аб роспуску II Дзяржаўнай думы і змяненні палажэння аб выбарах. Царскі ўказ ішоў уразрэз з маніфестам 17 кастрычніка 1905 г. і «Асноўнымі законамі Расійскай імперыі» (1906 г.), якія забаранялі без згоды Думы выдаваць новыя законы. Такім чынам, царызм здзейсніў своеасаблівы дзяржаўны пераварот, які азначаў паражэнне рэвалюцыі 1905—1907 гг. і

часовую перамогу сіл контррэвалюцыі. Па маніфесту 3 чэрвеня права адмяняць выбарчыя законы і выдаваць новыя захоўвалася за царом.

Новае законапалажэнне рэзка павялічвала колькасць выбаршчыкаў ад памешчыкаў і буйной буржуазіі. Землеўладальніцкай (памешчыцкай) курыі давалася больш палавіны (51%) агульнай колькасці выбаршчыкаў Еўрапейскай Расіі замест 32% пры выбарах у першыя дзве Думы. Буйной буржуазіі, якая складала першы разрад гарадскіх выбаршчыкаў, было дадзена права выбраць 15% выбаршчыкаў, дробнай буржуазіі і інтэлігенцыі (другі разрад) — 11%. Колькасць выбаршчыкаў ад рабочых скарачалася з 4 да 2% і ад сялян з 42 да 22% [1]. Такім чынам, зыход выбараў залежаў ад памешчыкаў.

Антынародны характар новага выбарчага закону праявіўся і ў тым, што выбарчым правам карысталіся толькі 15% насельніцтва Расіі [2]. Рэзка было скарочана прадстаўніцтва нацыянальных ускраін: Каралеўства Польскага, Каўказа, Забайкалля. Народы Сярэдняй Азіі, нярускія народнасці Забайкалля і іншыя зусім былі пазбаўлены права пасылаць сваіх дэпутатаў у Думу. Як і раней, да выбараў не дапускаліся ваеннаслужачыя, навучэнцкая моладзь, жанчыны. Не мелі выбарчых правоў сялянская бедната і батракі.

У заходніх губернях колькасць выбаршчыкаў ад памешчыкаў павялічвалася на 15,5% і складала 48,5%, а ад сялян зменшылася на 8,3% (да 29,5%). Тут землеўладальніцкая курыя атрымлівала меншую колькасць выбаршчыкаў, чым па Расіі ў цэлым, а скарачэнне выбаршчыкаў ад сялян у параўнанні з данымі па Расіі было нязначным. Такія асаблівасці выбарчага закону ў Заходнім краі тлумачыліся імкненнем урада зменшыць прадстаўніцтва ў Думе польскіх памешчыкаў, якія складалі большую частку мясцовых землеўладальнікаў-дваран.

Прамысловы пралетарыят Мінскай і Гродзенскай губерняў выбіраў на губернскія выбарчыя сходы па два выбаршчыкі, Віленскай і Магілёўскай — па аднаму. Рабочыя Віцебскай губерні наогул былі пазбаўлены права выбараў. Буйной буржуазіі было дадзена 70 месц (12%) у губернскіх сходах, дробнай буржуазіі і інтэлігенцыі — 9,3%.

Па новаму выбарчаму закону ў радзе ўскраін былі створаны асобыя «рускія» курыі, якія выбіралі дэпутатаў у Думу асобна ад іншага насельніцтва. Гэтым правам карысталася рускае насельніцтва Віленскай і Ковенскай губерняў, Варшавы, Закаўказзя. Рускае насельніцтва Віленскай губерні выбірала са свайго асяроддзя двух абавязковых дэпутатаў у Думу.

Акрамя таго, на падставе 29 і 35 арт. закону міністр унутраных спраў меў права дзяліць павятовыя з'езды землеўладальнікаў і з'езды гарадскіх выбаршчыкаў на аддзяленні па нацыянальнасці і ў адпаведнасці з гэтым размяркоўваць колькасць адзначаных у законе выбаршчыкаў паміж аддзяленнямі. Улічваючы «просьбы аб дапамозе», якія паступалі з заходніх губерняў ад «Саюза рускага народа», «Саюза 17 кастрычніка» аб абароне правоў «карэннага рускага насельніцтва» [3], міністр унутраных спраў распарадзіўся аб падзяленні з'ездаў землеўладальнікаў на два аддзяленні па нацыянальнасці ў Гродзенскай, Мінскай і Магілёўскай губернях, у сямі паветах Віцебскай губерні. Да першага аддзялення былі аднесены асобы, якія не належылі да польскай нацыянальнасці, да другога — «палякі», прычым у Віцебскай губерні да польскага аддзялення былі аднесены латышы.

Першыя з'езды ва ўсіх гарадах Мінскай губерні былі падзелены на тры аддзяленні: да першага былі аднесены выбаршчыкі «рускай» нацыянальнасці (да якіх прылічваліся праваслаўныя беларусы, немцы, тата-

---

[1] Ленин В. И. Полн. собр. соч. Т. 17. С. 455.

[2] Беркевнч А. Царский избирательный закон // Как выбирали в Государственную думу. Л., 1938. С. 117.

[3] ЦДАКР СССР, ф. ДП, 00, 1907, воп. 237, с. 110, л. 12.

ры), да другога — «палякі» (да іх прылічваліся і беларускія сялянекатолікі), да трэцяга — яўрэі.

Другая гарадская курыя Мінскага павета была падзелена на два аддзяленні: да першага былі аднесены асобы «рускай», а да другога—асобы іншых нацыянальнасцей. «Рускія» гарадскія аддзяленні, якія забяспечвалі мясцовым чыноўнікам і папам выбары свайго дэпутата па II гарадской курыі, былі створаны таксама ў Гродзенскім і Бабруйскім паветах. У Віцебскім, Дзвінскім, Магілёўскім паветах да першага аддзялення былі аднесены асобы, якія не належылі да яўрэйскай нацыянальнасці, а да другога — яўрэі. Па новаму выбарчаму закону яўрэйская буржуазія аказалася пазбаўленай магчымасці сваім удзелам аказаць які-небудзь уплыў на вынікі выбараў.

Дзяленне на нацыянальныя аддзяленні праводзілася з разлікам на распальванне нацыянальнай варожасці ў Беларусі. У. І. Ленін ахарактарызаваў падзеі 3 чэрвеня 1907 г. як ганебнае злачынства самадзяржаўя супраць народа, а «Палажэнне аб выбарах» як «...агідны выбарчы закон» [4].

Царызмам былі прыняты ўсе меры да падтрымання парадку ў прадбачанні незадаволенасці ў народзе ў сувязі з разгонам II Думы і выданнем новага выбарчага закону. 70% губерняў краіны былі аб'яўлены на становішчы надзвычайнай і ўзмоцненай аховы. Указам міністра ўнутраных спраў становішча ўзмоцненай аховы было працягнута ў большасці паветаў Віленскай, у Пружанскім і Кобрынскім паветах Гродзенскай губерні [5]. Асаблівая ўвага ў Заходнім краі надавалася Мінскай губерні і г. Мінску, дзе таксама захоўвалася становішча ўзмоцненай аховы. Па хадайніцтву Магілёўскага губернатара на становішчы надзвычайнай аховы быў пакінуты Гомельскі павет. Мясцовымі ўладамі прыводзіліся ў гатоўнасць жандарска-паліцэйскія сілы.

У другой палавіне 1907 г. адносіны да выбарчай кампаніі ў III Дзяржаўную думу былі ў цэнтры ўвагі ўсіх палітычных сіл і партый у Расіі, якія адпавядалі тром асноўным лагерам. Класавы і партыйны састаў іх У. І. Ленін вызначыў наступным чынам: «Чарнасоценцы (класавыя інтарэсы прыгоннікаў-памешчыкаў) і «бюракратыя» побач з імі і над імі, потым ліберальна-манархічная буржуазія, «цэнтр»— левы (к.-д.) і правы (акцябрысты); нарэшце, дэмакратыя буржуазная (трудавікі, народнікі, беспартыйныя левыя) і пралетарская» [6].

Ва ўрадавы лагер уваходзілі «Саюз рускага народа» і іншыя крайнія правыя арганізацыі, якія аб'ядноўвалі найбольш рэакцыйных памешчыкаў, буйных домаўласнікаў, духавенства, чыноў паліцыі, кулакоў. Яны былі адзіныя ў адстойванні ўсяго старога, сярэдневяковага ў жыцці краіны, у задаволенасці памешчыцкай канстытуцыяй 3 чэрвеня, у абароне прывілеяў дваранства і чыноўніцтва. Для ўсіх правых партый быў характэрны яры вялікадзяржаўны шавінізм.

Арганізацыі «Саюза рускага народа» існавалі ў губернскіх і амаль ва ўсіх павятовых гарадах і многіх мястэчках Беларусі. Кіруючыся дырэктывамі Галоўнага савета «Саюза», да актыўнай перадвыбарчай дзейнасці прыступілі мінскія чарнасоценцы, узначальваемыя лідэрам «сапраўды рускіх» у Заходнім краі, рэдактарам іх друкаванага органа «Мінскае слова» Г. К. Шмідам. У адкрытым пісьме да выбаршчыкаў Мінскай губерні яны, спасылаючыся на «польскую і яўрэйскую небяспеку», заклікалі да згуртавання і абароны «рускіх» інтарэсаў на месцах і ў будучай Думе [7].

Шырокую агітацыйную работу праводзіў Гомельскі аддзел «Саюза», які ўзначальваў царскі чыноўнік Е. А. Брэнке. Разам з вядомым агітатарам-чарнасоценцам А. І. Давыдавым яны ў жніўні 1907 г. узначаль-

[4] Ленин В. И. Полн. собр. соч. Т. 16. С. 139.
[5] ЦДГА СССР, ф. 1276, воп. 3, 1907, с. 176, л. 137, 138.
[6] Ленин В. И. Полн. собр. соч. Т. 21. С. 38.
[7] Минское слово. 1907. 3 ліп.

валі чарнасоценныя зборышчы ў Магілёве, Віцебску і іншых гарадах Беларусі. Мясцовым аддзелам аказваў дапамогу Галоўны савет. Так, у ліпені 1907 г. ім было пераведзена ў Беласток 6 тыс. руб. на патрэбы мясцовых арганізацый «Саюза» [8].

У заходніх губернях з «Саюзам рускага народа» блакіраваўся «Саюз 17 кастрычніка». Глебай для іх аб'яднання з'яўляўся шалёны шавінізм. Гэты альянс праявіўся ў стварэнні «Рускага ўскраіннага саюза». Да ліку яго стваральнікаў адносіліся лідэр віленскай чарнасоценнай арганізацыі «Селянін» С. А. Кавалюк, стацкі саветнік і магістр багаслоўя П. А. Бывалькевіч, царскі чыноўнік А. С. Вруцэвіч і Г. К. Шмід. Аддзел «ускраіннага саюза» быў адкрыты ў Мінску. Укамплектаваны за кошт членаў мінскіх аддзелаў «Саюза рускага народа», «Саюза 17 кастрычніка» і прадстаўнікоў праваслаўнага духавенства, кіруемы Г. К. Шмідам і рэдактарам «Мннских епархиальных ведомостей» Д. В. Скрынчанкам, пры падтрымцы мясцовай адміністрацыі і паліцыі, ён падпарадкаваў сабе фактычна ўвесь ход выбарчай кампаніі ў Мінскай губерні.

Лідэры «Саюза» праз газету «Мінскае слова» сеялі міжнацыянальнае адрозненне і нянавісць да яўрэяў, каталіцкага духавенства і памешчыкаў-палякаў, патрабавалі нястрыманай русіфікацыі заходніх губерняў. У чэрвені — жніўні 1907 г. аддзелы «Рускага ўскраіннага саюза» былі створаны ў многіх паветах Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Мінскай і Магілёўскай губерняў.

На баку крайне рэакцыйных сіл, якія падтрымлівалі царызм, выступала праваслаўнае духавенства. Шматтысячная армія царкоўнікаў заклікала сваю паству да беспярэчнага падпарадкавання «цару-бацюхну». Яны імкнуліся пераканаць сялян, што для задавальнення іх патрэб неабходна «руская народная Дума на чале з неабмежаваным самадзержцам».

Чым бліжэй былі выбары, прызначаныя ўрадам на верасень 1907 г., тым больш актывізавалася дзейнасць духавенства. Епіскап Гомельскі Мітрафан ажыццявіў у мэтах агітацыі сялян паездку па Горацкаму, Клімавіцкаму, Чавускаму, Сенненскаму паветах. Епіскап Мінскі і Тураўскі Міхаіл разаслаў па епархіі рад цыркуляраў, якія абавязвалі гарадскіх і сельскіх свяшчэннікаў садзейнічаць выбранню толькі «сапраўды рускіх» дэпутатаў. Сам ён афіцыйна ўзначаліў «рускі» перавыбарчы камітэт у Мінскай губерні [9].

З'яўляючыся актыўным прыхільнікам самадзяржаўя ў барацьбе з рэвалюцыйным рухам, царква адкрыта благаслаўляла банды чарнасоценцаў на «ратныя справы», на барацьбу з рэвалюцыяй. Сінод пільна сачыў за тым, каб аддзелы «Саюза рускага народа» атрымалі паўсюдна благаславенні «святых айцоў». Пры ўдзеле ўсяго гарадскога духавенства 15 ліпеня 1907 г. у Магілёве епіскап Магілёўскі і Мсціслаўскі Стэфан асвяціў сцяг Магілёўскага аддзела «Саюза», заклікаючы праваслаўнае насельніцтва да аб'яднання пад яго сцягам, «для абароны цара самадзяржаўнага, царквы хрыстовай, веры праваслаўнай» [10]. 17 ліпеня епіскапам Серафімам былі асвечаны харугві Віцебскага аддзела «Саюза». А калі Чавускі пратаірэй Палубінскі адмовіўся служыць малебен па запрашэнню мясцовага аддзела «Саюза», ён у выніку быў аддадзены на суд сінода [11].

З «Рускім ускраінным саюзам» блакіраваліся «Заходнерускія праваслаўныя брацтвы», якія аб'ядноўвалі ў сваіх радах царкоўна-грамадскіх дзеячаў заходніх губерняў і чарнасоценных царскіх чыноўнікаў. Найбольш буйныя рэлігійныя арганізацыі былі створаны ў Мінскай губерні — Мінскае царкоўна-народнае брацтва «Святога крыжа» і Мінскае Мікалаеўскае брацтва. Іх узначальвалі ўладальнік друкарні С. А.

[8] Северо-западный голос. 1907. 19 жи.
[9] Северо-западный голос. 1907. 1 вер.
[10] Могнлевский вестник. 1907. 11 вер.
[11] Могилевский вестник. 1907. 4 вер.

Някрасаў і епархіяльны назіральнік царкоўных школ губерні О. Д. Паўскі. Епархіяльнае Свята-Духоўнае брацтва, якое ўзначальваў выкладчык духоўнай семінарыі А. І. Мілавідаў, актыўна дзейнічала ў Вільні. Выкладчык жаночай гімназіі айцец Сергій Івацэвіч накіроўваў работу Гродзенскага Сафійскага брацтва [12].

Ідэолагі праваслаўя імкнуліся найбольш эфектыўна ўздзейнічаць на свядомасць мас. Выдавалася вялікая колькасць брашур, артыкулаў прапагандысцкага характару з мэтай пасеяць міжнацыянальныя сваркі і спрэчкі, паказаць, што праваслаўе з'яўляецца «сапраўднай» рэлігіяй беларускага народа. У Мінску і Гродна ў час выбараў у III Дзяржаўную думу прадстаўнікі брацтва ўдзельнічалі на ўсіх нарадах рускіх арганізацый па пытанню аб выбарах рускіх дэпутатаў у Дзяржаўную думу [13].

28—31 жніўня 1907 г. у Мінску адбыўся першы з'езд заходнерускіх брацтваў, на якім праваслаўнаму духавенству заходніх губерняў у якасці галоўнай задачы было пастаўлена прыцягненне народа да царкоўнага жыцця і згуртавання яго ў цесныя «брацкія» саюзы. Тое, што з'езд адбыўся менавіта напярэдадні выбараў у III Думу, не было выпадковым. Царызм імкнуўся з дапамогай служыцеляў царквы ўзмацніць яшчэ больш міжнацыянальную і рэлігійную барацьбу ў Беларусі. Мікалай II асабіста вітаў удзельнікаў з'езда тэлеграмай наступнага зместу: «Жадаю поўнага поспеху дзейнасці праваслаўных брацтваў у заходніх губернях» [14].

Галоўнай партыяй расійскай ліберальнай буржуазіі была «партыя народнай свабоды» — кадэты. Сацыяльную апору партыі складалі розныя элементы буржуазнага грамадства: ліберальныя памешчыкі, прадстаўнікі буржуазнай інтэлігенцыі, дробная буржуазія. Асновай кадэцкай тактыкі было адмаўленне ад рэвалюцыі і супрацьпастаўленне ёй канстытуцыйнага развіцця Расіі. У перыяд спаду рэвалюцыйнага руху адбылося рэзкае паправенне кадэтаў і яны па многіх пытаннях наблізіліся да правых партый. Пасля падзей 3 чэрвеня ўсе колькі-небудзь дэмакратычныя элементы пакінулі яе рады. Па прызнанню аднаго з лідэраў партыі П. Н. Мілюкова, кадэты перасталі існаваць як арганізацыйнае цэлае.

Стан крызісу і развалу перажывалі кадэты і ў Беларусі. У ліпені — верасні 1907 г. толькі невялікія гурткі існавалі ў Мінску, Гродна, некаторых паветах Віленскай і Віцебскай губерняў [15]. Таму як самастойная палітычная адзінка кадэты ў перадвыбарчай барацьбе не выступалі, а блакіраваліся з рознымі буржуазна-нацыяналістычнымі групоўкамі, у асноўным з яўрэйскімі і польскімі, выступаючы пад сцягам беспартыйнасці.

У ліпені 1907 г. у Віцебскай, Магілёўскай, Мінскай, Віленскай, Ковенскай і Гродзенскай губернях узнікла новая арганізацыя польскіх памешчыкаў і каталіцкага духавенства — «Краёвая партыя Літвы і Беларусі». Адным з яе заснавальнікаў быў старшыня Мінскага сельскагаспадарчага таварыства Э. А. Вайніловіч. У § 5 праграмы партыі гаварылася: «З'яўляючыся рашучымі прыхільнікамі канстытуцыйнай манархіі... мы будзем імкнуцца да замацавання грамадзянскіх свабод шляхам заканадаўчым і да шырокага самакіравання для вырашэння пытанняў, цесна звязаных з мясцовымі патрэбамі» [16]. З праграмы відаць, што «Краёвая партыя Літвы і Беларусі» знаходзілася пад уплывам кадэтаў, хоць па аграрнаму пытанню займала правыя пазіцыі.

---

[12] Труды съезда представителей западно-русскнх православных братств, состоявшегося в Мпнске 29—31 августа 1908 г. Мннск, 1908. С. 1, 2.

[13] Миловидов А. М. Западно-русскне православные братства, нх современное значенне и задачи. Вильно, 1913. С. 3.

[14] Там жа. С. 5.

[15] Речь. 1907. 26 вер.; Витебские губернские ведомости. 1907. 13 вер.

[16] Витебскне губернскне ведомости. 1907. 7 ліп.

У ліпені 1907 г. пытанне аб адносінах да выбараў разглядалася таксама і ў сіяніцкіх арганізацыях Расіі. Сіяніцкім камітэтам на месцах было рэкамендавана прымаць удзел у выбарах, калі была хоць бы верагоднасць правядзення іх дэпутата ці мог прайсці кандыдат, які абавязаўся б у Думе адстойваць «палітычныя і нацыянальныя правы яўрэяў» [17]. Замест «Саюза паўнапраўя яўрэяў», які распаўся летам 1907 г., у выбарчую кампанію ў Віленскай, Гродзенскай і Віцебскай губернях актыўна ўключылася «Яўрэйская народная група» [18]. Буржуазныя сіяністы прапаведавалі крайні нацыяналізм і іудаізм, маючы на мэце адцягнуць увагу яўрэйскіх працоўных ад барацьбы супраць сваёй буржуазіі і ад рэвалюцыйнага руху.

Вядучай сілай дэмакратычнага лагера быў пралетарыят на чале з партыяй бальшавікоў. Як і раней, бальшавікі накіроўвалі ўсе свае намаганні на развіццё арганізаванасці і свядомасці працоўных. Вялікае значэнне для іх палітычнай адукацыі і правільнага вызначэння палітычных пазіцый на выбарах адыгралі рашэнні V (Лонданскага) з'езда РСДРП, III канферэнцыі РСДРП (ліпень 1907 г.) і выбарчая дэкларацыя, з якой ЦК РСДРП звярнуўся да рабочых і сялян. У гэтым дакуменце была раскрыта злачынная дзейнасць урада і падтрымаўшых яго партый чарнасоценцаў і акцябрыстаў. Бальшавікі заклікалі весці барацьбу не толькі з самадзяржаўем, але і са здрадніцкай палітыкай буржуазнага лібералізму. Яны закляймілі ганьбай кадэтаў, «запляміўшых сябе як здраднікаў» [19].

Кіруючыся ўказаннямі У. І. Леніна, рашэннямі III канферэнцыі РСДРП, выбарчай платформай партыі, уцалелыя ад рэпрэсій і арыштаў бальшавікі Беларусі актыўна ўключыліся ў падрыхтоўку да выбараў. Працаваць даводзілася ў вельмі цяжкіх умовах. Большасць партыйных арганізацый была разгромлена паліцыяй, многія партыйныя работнікі арыштаваны. Летам 1907 г. былі разгромлены паліцыяй партыйныя арганізацыі ў Мінску, Гомелі, Віцебску, Оршы, Магілёве, Смаргоні, Мазыры, Пінску і іншых гарадах.

Але дзякуючы цесным сувязям з масамі, некаторыя мясцовыя арганізацыі РСДРП праявілі жыццяздольнасць і працягвалі сваю работу ў адпаведнасці з умовамі, якія змяніліся. У канцы верасня 1907 г. пры дапамозе ЦК партыі была адноўлена і разгорнута актыўная дзейнасць Мінскай групы РСДРП. Начальнік Мінскага ахоўнага аддзялення ў кастрычніку 1907 г. даносіў у дэпартамент паліцыі: «...Асабліва сур'ёзных да сябе адносін патрабуе Мінская арганізацыя РСДРП» [20]. Бальшавікі Мінска аказвалі вялікую дапамогу ў наладжванні агітацыйнай работы партыйным ячэйкам і групам, якія існавалі ў Бабруйскім, Слуцкім, Навагрудскім, Барысаўскім і Рэчыцкім паветах [21].

Галоўнай формай работы партыйных арганізацый у масах была вусная прапаганда і распаўсюджванне лістовак. За захоўванне нелегальнай літаратуры ў чэрвені 1907 г. быў асуджаны селянін вёскі Дукоркі Ігуменскага павета Мінскай губерні А. О. Гуло [22]. Склады рэвалюцыйнай літаратуры былі захоплены паліцыяй у Віленскім павеце. У верасні 1907 г. за распаўсюджванне пракламацый РСДРП, у тым ліку і «Выбарчай платформы РСДРП», у Лоеве Рэчыцкага павета былі арыштаваны Г. Б. Фейгін, Ш. Р. Хракоўскі і інш.[23]

Бальшавікі імкнуліся шырэй распаўсюдзіць разуменне сутнасці III Думы як прамога органа самадзяржаўна-чарнасоценнай рэакцыі,

---

[17] ЦДАКР СССР, ф. ДП, 00, 1907, с. 472 (2), л. 124.
[18] Окраина. 1907. 2 июл.; Витебские губернские ведомости. 1907. 29 июл.
[19] ЦДАКР СССР, ф. ДП, 00, 1907, воп. 237, с. 475, л. 158—162.
[20] Там жа, с. 12, ч. 32, л. 144, 145.
[21] Очерки истории Коммунистической партии Белоруссии. Минск, 1968. Ч. 1. С. 180.
[22] ЦДАКР СССР, ф. МЮ, 1909, с. 811, л. 3.
[23] Там жа, с. 814, л. 1, 2.

раскрывалі падман і крывадушнасць урада і партый, якія яго падтрымлівалі.

Бальшавікам у правядзенні рэвалюцыйнай партыйнай лініі даводзілася пераадольваць супраціўленне з боку меншавікоў. Калі бальшавікі разглядалі Думу як трыбуну для выкрыцця не толькі царызму, чарнасоценных партый, але і кадэтаў, то меншавікі лічылі, што ў «перыяд незакончанай рэвалюцыі Дума павінна адыграць ролю цэнтра і кіраўніка рэвалюцыйнай барацьбы» [24]. Яны выступалі за блокі з кадэтамі, тым самым дапамагаючы буржуазіі сеяць канстытуцыйныя ілюзіі аб магчымасці заваявання палітычных свабод без звяржэння самадзяржаўя. Адмовіўшыся ад рэвалюцыйнай праграмы і тактыкі партыі, яны фактычна сталі на шлях яе ліквідацыі.

З меншавікамі блакіраваліся бундаўцы. У жніўні 1907 г. ЦК Бунда планаваў правядзенне губернскіх канферэнцый мясцовых арганізацый для таго, каб намеціць практычныя крокі ў выбарчай кампаніі [25]. Бундаўскія арганізацыі ў Беларусі ў гэты час фактычна абмяжоўваліся рамкамі легальнай дзейнасці. Так, начальнік Віленскага ахоўнага аддзялення ў данясенні ў дэпартамент паліцыі паведамляў: «...Што датычыцца арганізацыі «Бунда», то апошняя на працягу жніўня і верасня 1907 г. накіроўвала сваю дзейнасць на перадвыбарчую агітацыю і агітавала ў рамках законнасці... Асаблівай патрэбы ў назіранні за гэтай арганізацыяй не сустракалася» [26].

Не змаглі правільна ацаніць абстаноўку ў краіне і выпрацаваць адпаведную тактыку і эсэры. Гэта праявілася перш за ўсё ў адносінах да III Дзяржаўнай думы. У першых чыслах ліпеня 1907 г. адбыўся VII з'езд Паўночна-Заходняй арганізацыі партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў, на якім прысутнічалі прадстаўнікі арганізацый Мінскай, Віцебскай, Смаленскай, Гродзенскай, Ковенскай губерняў. У прынятай на з'ездзе рэзалюцыі па пытанню аб адносінах да выбараў у III Думу адзначалася, што паколькі па новаму выбарчаму закону сацыялістычныя партыі пазбаўлены магчымасці перашкодзіць тактыцы ўрада, што III Дума не можа быць выкарыстана ў сэнсе агітацыі і арганізацыі шырокіх народных мас, то ў адносінах да выбараў неабходна прыняць тактыку байкоту. З'езд заклікаў партыйныя арганізацыі не губляць час на «бескарысны і нават шкодны для народа ўдзел у Думе... і прыняць усе меры да падрыхтоўкі ўзброенага паўстання» [27].

Тактыка эсэраў была падвергнута рэзкай крытыцы У. І. Леніным. Ён адзначаў, што ў эсэраўскай матывіроўцы байкоту Думы «адсутнічае зусім разбор гістарычных умоў выкарыстання байкоту». «Байкот,— пісаў У. І. Ленін,— выводзіцца не са ступені рэакцыйнасці той ці іншай установы, а з наяўнасці тых умоў барацьбы, пры якіх, як паказаў ужо цяпер вопыт і рускай рэвалюцыі, можа выкарыстоўвацца своеасаблівы сродак, які называецца байкотам» [28].

У верасні 1907 г. ва ўмовах разгулу чорнай сотні ў заходніх губернях пачаліся выбары ў III Думу. У рабочай курыі ў іх прыняло ўдзел 62% рабочых, якія мелі права ўдзельнічаць у выбранні ўпаўнаважаных, па Расіі ў цэлым — 25% [29]. Паказчыкам настрояў рабочых было тое, што ў губернскіх сходах было выбрана 6 левых выбаршчыкаў, у тым ліку 1 сацыял-дэмакрат (рабочы цвіковага завода ў г. Нова-Вілейцы А. В. Догі) [30].

На першай стадыі выбараў назіралася адносна высокая актыўнасць

---

[24] Пролетарий. 1907. 29 кастр.

[25] Окраина. 1907. 10 жн.

[26] ЦДАКР СССР, ф. ДП, 00, 1907, с. 5, ч. 6, л. 78.

[27] ЦДГА СССР, ф. 1741, 1907, вон. 1, с. 21022, л. 1.

[28] Ленин В. И. Полн. собр. соч. Т. 16. С. 4.

[29] Выборы в Государственную думу третьего созыва (Стат. отчет особого делопроизводства). СПб., 1911. С. XXI.

[30] ЦДАКР СССР, ф. ДП, 00, воп. 237, с. 475, л. 150; Речь, 1907. 4 вер.

сялянскіх выбаршчыкаў у Гродзенскай (75%) і Мінскай (73%) губернях. Але ў цэлым ад 5 заходніх губерняў у выбранні ўпаўнаважаных ад валасцей прынялі ўдзел 41% сялян-выбаршчыкаў, у той час як па Расіі 65%. Галоўнай прычынай слабай актыўнасці сялян на выбарах было нявер'е ў Думу і таму адсутнасць цікавасці да выбараў. На наступных трох стадыях на сялянскіх выбаршчыкаў быў аказаны прамы націск з боку мясцовых улад, праваслаўнага духавенства і правых манархічных партый: фальсіфікаваліся спісы, часта несвоечасова ўручаліся павесткі. Напярэдадні губернскіх выбараў праваслаўныя свяшчэннікі, чарнасоценцы з «Саюза рускага народа» і «Рускага ўскраіннага саюза» збіралі сялянскіх выбаршчыкаў у асобныя памяшканні, вялі нацыяналістычную прапаганду і патрабавалі галасаваць толькі за іх кандыдатаў. Да таго ж па новаму выбарчаму закону абавязковы дэпутат ад сялян выбіраўся не сялянамі, а ўсім саставам губернскага сходу, г. зн. у першую чаргу памешчыкамі і духавенствам.

У цэлым у III Думу ад 5 заходніх губерняў было выбрана 36 дэпутатаў. З іх памешчыкаў было 12 (33,3%), прадстаўнікоў праваслаўнага духавенства — 7 (19,3%), каталіцкага — 1 (2,9%), царскіх чыноўнікаў і буржуазных інтэлігентаў — 5 (14%), сялян — 11 (30,5%). Пераважная большасць дэпутатаў была прадстаўлена памешчыкамі і духавенствам — 56%. Урадавыя партыі па Расіі атрымалі 269 месцаў у Думе (61%), лібералы — 115 (26%), дэмакраты — 27 (6%). Ураду з трэцяй спробы ўдалося стварыць паслухмяную «народную» прадстаўнічую ўстанову.

У Гродзенскай, Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай губернях урадавыя партыі («Саюз рускага народа» і правыя акцябрысты) заваявалі 27 месцаў з 29. У Віленскай губерні 5 месцаў у Думе атрымала польска-літоўска-беларуская група і 2 месцы чарнасоценцы. У Гродзенскай губерні акрамя 5 правых былі выбраны адзін прагрэсіст і адзін прадстаўнік «Краёвай партыі Літвы і Беларусі». Дэмакратычным сілам не ўдалося правесці ніводнага дэпутата ў Думу. Выбраныя такім шляхам дэпутаты не адлюстроўвалі настрояў працоўных мас Беларусі.

Сялянскія дэпутаты-трудавікі, нават прасеяныя праз паліцэйскія сіты, выбраныя памешчыкамі, выступілі ў Думе «...за прымусовае адсуджэнне зямлі і за выбраныя ўсім насельніцтвам мясцовыя зямельныя ўстановы» [31]. Паказальныя ў гэтых адносінах выступленні сялянскіх дэпутатаў у Думе ад заходніх губерняў В. Г. Амасёнка і Ф. Т. Шаўцова. Яны, хоць і ў вельмі асцярожнай форме, выказваючы адданасць царскаму прастолу, тым не менш лічылі, што малазямельныя і беззямельныя сяляне павінны быць надзелены зямлёй за кошт памешчыкаў [32].

Такім чынам, урадавым партыям, выкарыстоўваючы папраўкі да выбарчага закону ў дачыненні да заходніх губерняў, розныя махінацыі мясцовай адміністрацыі, удалося правесці ў Думу 80,5% сваіх дэпутатаў, у той час як па Расіі ў цэлым 61,1%. Гэты факт дазваляе зрабіць вывад, што палітыка царызму ў заходніх губернях у перыяд сталыпінскай рэакцыі адрознівалася крайняй рэакцыйнасцю, а ўплыў крайніх правых партый на палітычнае жыццё быў больш значным, чым у цэлым па Расіі.

Лібералы, прадстаўленыя ў асноўным «Краёвай партыяй Літвы і Беларусі», змыкаліся з кадэтамі па агульнапалітычных і нацыянальных пытаннях. Па важнейшаму пытанню грамадска-палітычнага жыцця таго часу — аграрнаму яны займалі рэакцыйныя пазіцыі, як і ўсе памешчыкі Расіі. У заходніх губернях лібералы атрымалі 19,4% дэпутацкіх месцаў, прыкладна столькі ж, як і па Расіі (16,1%).

Выбары па рабочай курыі паказалі, што пралетарыят Беларусі, ня-

---

[31] Ленин В. И. Полн. собр. соч. Т. 16. С. 425.

[32] Государственная дума. Третий созыв. Стенографические отчеты, сессия II, ч. 1, стб. 991—992, 1266—1267, 1340—1343.

гледзячы на разгул рэакцыі і шавінізму ў палітыцы ўрада і дзейнасці памешчыцкіх шавіністычных партый, застаўся на рэвалюцыйных пазіцыях.

*Інстытут гісторыі АН БССР*

## Резюме

Показана антинародная сущность третьеиюньского избирательного закона применительно к западным губерниям, произвол властей в организации выборов. Освещается деятельность и политическая борьба в связи с выборами партий и организаций трех общественно-политических лагерей — правительственного, либерально-буржуазного и демократического.

## Summary

The anti-national essence of the 3rd June electoral law as applied to the west provinces, the tyranny of powers in organization of elections are shown. The activity and political struggle in connection with elections of parties and formation of three social-political camps, i. e. governmental liberal-bourgeois and democratic are elucidated.